# Дзесяць тысяч кіламетраў за 15 дзён

## Гродна і Полацк на шляху патрыятычнай акцыі

**Праект «Цягнік Памяці» стартаваў у Брэсце, дзе прадстаўнікі васьмі краін прынялі ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных пачатку Вялікай Айчыннай вайны. За два тыдні 200 старшакласнікаў з Беларусі, Расіі, Кыргызстана, Арменіі, Казахстана, Азербайджана, Таджыкістана і Узбекістана наведаюць 13 гарадоў Беларусі і Расіі, сустрэнуцца з ветэранамі, пабываюць на самых знакавых мемарыялах, даведаюцца больш аб гісторыі і культуры сяброўскіх народаў.**

У нядзелю, 23 чэрвеня, «Цягнік Памяці» спыніўся ў Гродне. На чыгуначным вакзале гасцям арганізавалі цёплую сустрэчу. Удзельнікаў вітаў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК.** Ён падкрэсліў, што Гродна багаты сваім гістарычным мінулым і самабытным абліччам. Нядаўна горад прымаў гасцей фестывалю нацыянальных культур, а цяпер сюды прыехалі юныя ўдзельнікі маштабнага міжнароднага праекта. Гродзенцам ёсць што паказаць юным патрыётам.

Удзельнікі праекта расказалі, што пачатак маршруту ўжо прынёс шмат незабыўных эмоцый. Напрыклад, Абдуло Абдулоеў з Таджыкістана знаходзіцца пад уражаннем ад рэканструкцыі пачатку вайны ў Брэсцкай крэпасці. Многіх здзівілі сваёй веліччу зубры ў Белавежскай пушчы. Беларускія пагранічнікі прадэманстравалі, як затрымліваюць парушальнікаў дзяржаўнай граніцы.

Па словах **члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, першага сакратара ЦК БРСМ Аляксандра ЛУК'ЯНАВА**, «Цягнік Памяці» стаў сімвалам будучыні ў аб'яднанні народаў. Усе прадстаўнікі Беларусі — пераможцы конкурсу «Я — патрыёт сваёй краіны». У адборачным туры прынялі ўдзел больш за 15 тысяч старшакласнікаў.

Як адзначыла **расійскі сенатар Алена АФАНАСЬЕВА**, падобныя адукацыйныя праекты садзейнічаюць развіццю ў моладзі пачуцця згуртаванасці, праяўленню ініцыятывы і жадання ўнесці свой уклад у агульную справу. Яна падзякавала за цёплы прыём і выказала спадзяванні, што сяброўскія адносіны паміж удзельнікамі праекта выйдуць за межы цягніка, а знаёмства з Беларуссю стане нагодай зноў сюды вярнуцца.

«У Беларусі надзвычай ветлівыя і гасцінныя людзі, — расказала Анастасія Салюкова з Санкт-Пецярбурга. — Нас сустракаюць вельмі ўрачыста — з музыкай, з аркестрам. Я ў Беларусі другі раз, летась была ў Мінску, і вось новыя прыгожыя гарады — Брэст і Гродна. Мне, як чалавеку, які вывучае гісторыю сваёй краіны, гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, вельмі карысна набыць новы вопыт».

Лейла Гасанлі з Азербайджана прызналася, што даўно марыла пабываць у Гродне, і вось нарэшце яе мара спраўдзілася. Таксама яна ўпэўнена, што беларусам заўсёды рады ў яе роднай краіне.

У горадзе над Нёманам удзельнікі праекта пабывалі ў Старым і Новым замках, музеі гісторыі Гарадніцы, Свята-Пакроўскім кафедральным саборы, Лютэранскай кірсе, прайшліся па парку Жылібера, даведаліся, дзе знаходзілася яўрэйскае гета. Па традыцыі перад ад'ездам з Гродна ўдзельнікі патрыятычнай экспедыцыі адправілі сваім родным памятныя паштоўкі. Пасля Гродна «Цягнік Памяці» накіраваўся ў старажытны Полацк.



У Полацку — самым старажытным горадзе Беларусі — школьнікаў на пероне разам з танцорамі і спевакамі сустракаў... Францыск Скарына.

**Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў ДУРНОЎ**, звяртаючыся да ўдзельнікаў праекта, адзначыў, што знаходжанне на Полацкай зямлі павінна запомніцца надоўга. «Шостага ліпеня Полацк будзе святкаваць свой дзень нараджэння, а ў 1944 годзе тут праходзілі жорсткія баі. Але вось ужо 80 гадоў мы жывём пад мірным небам, і гэта цудоўна. Упэўнены, што ваша сяброўства, якое сёння стане яшчэ мацнейшым, пройдзе з вамі праз усё жыццё, а гэта — залог сяброўства нашых краін, бо вы, моладзь, — наша будучыня!» — падкрэсліў Вячаслаў Віктаравіч.

Удзельнікі праекта наведалі мемарыяльны комплекс «Урочышча Пяскі», Спаса-Ефрасінеўскі манастыр, Полацкае кадэцкае вучылішча, Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора. Запамінальнай для моладзі стала экскурсія па Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Е. Полацкай, дзе школьнікі змаглі пагаварыць з Механічнай галавой, а таксама канцэрт арганнай музыкі ў полацкай Сафіі.

За 15 дзён плануецца пераадолець 10 тысяч кіламетраў. Завершыцца падарожжа 3 ліпеня ў Мінску.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**